**В.І. Караткевіч (Магілёў)**

## Фэнтэзі ў дзіцячым чытанні (некалькі заўваг да п'есы С. Кавалёва "Драўляны рыцар")

Фэнтэзі як асобы від літаратуры здаўна прыцягвае да сябе ўвагу падлеткаў, бо вызначаецца дынамічнасцю сюжэта і магчымасцю дапушчэнняў ірацыянальнага характару. Гэта абумоўлена тым, што ў 12–15 гадоў у дзяцей рэзка актывізуецца пазнавальная дзейнасць, цікаўнасць да незвычайных з'яў прыроды, светабудовы, гісторыі, падлеткі часцей імкнуцца асэнсаваць з'явы рэчаіснасці, у тым ліку праз стварэнне асобых паралельных светаў. У гэтых адносінах літаратура фэнтэзі – найбольш удзячная, бо ў такога рода кнігах дзеці могуць выступаць сааўтарамі, упісваючы ўласныя фантазіі ў ірацыянальны свет твора.

Абагульняючы тэарэтычныя літаратуразнаўчыя працы [1, 3, 4] і ўласныя тэарэтычныя высновы, сфармулюем некаторыя найбольш важныя для нашага даследавання палажэнні.

Фэнтэзі бярэ свой пачатак у архаічных міфах, фальклорнай чарадзейнай казцы, сярэднявечным еўрапейскім рыцарскім рамане, літаратуры рамантызму XIX ст., акультнай і містычнай літаратуры XIX – пачатку XX стст. Таму рэцыпіент заўсёды звяртаецца да такога роду тэксту праз іншыя тэксты. Пры асэнсаванні фэнтэзійнага тэксту падлеткам важна данесці гэтую акалічнасць. Фэнтэзі становіцца стымулам да засваення новых ведаў, культурных традыцый розных народаў. Адсюль вынікае, што фэнтэзі ўключаецца ў інтэртэкст і гіпертэкст, бо створана з цытат і алюзій, як яўных, так і змадэляваных.

У такіх творах час мае цыклічны характар[1], мінулае тут ідэалізуецца, а будучае ўяўляе сабой няпэўнасць, магчымасць выбару. Прастора ствараецца праз узнаўленне рэалій паралельнага свету, дзе робіцца дапушчэнне існаванне ірэальнага, фантастычнага, незвычайнага. У гэтых адносінах фэнтэзі набліжаецца да абсурдысцкіх твораў, дзе рэальнасць змешваецца з ірэальнасцю, каб паказаць рэцыпіенту недарэчнасць існавання асобы ў свеце і засяродзіць увагу на праблемах паразумення са светам.

Вобразная сістэма будуецца праз падрабязнае выпісванне псіхалагічных партрэтаў герояў і асэнсаванне іх "я". Па сутнасці фэнтэзійныя творы дастаткова эгацэнтрычныя. Часцяком пісьменнікі ідуць па шляху дэгераізацыі сваіх персанажаў. Як правіла, становучы герой – просты чалавек, які добра ведае сваю справу, а добрыя ўчынкі – гэта стыль яго жыцця, ён

[1] Дастаткова прыгадаць цыкл раманаў Дж. Роўлінг пра Гары Потара, дзе кожная кніга расказвае пра адзін год са школьнага жыцця малога чараўніка. Разам з тым, кожны новы год – гэта новы этап у развіцці асобы дзіцяці і новы этап барацьбы з сусветным злом, новы этап выратавання свету.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ніколі не задумваецца, калі дапамагае іншым. Барацьба са злом мае экзістэнцыяльны характар.

Ц. Тодараў лічыў, што “эфект фантастычнага дасягаецца ў выніку выканання трох умоў жанру: 1) тэкст павінен заахвоціць чытача ўспрыняць свет персанажаў як свет людзей, якія жывуць рэальным жыццём, і адчуваць некаторы ваганне паміж натуральным і звышнатуральным тлумачэннем адлюстраваных падзей; 2) гэтае ваганне або сумнеў можа адчуваць таксама персанаж – на гэтым узроўні яно становіцца адным з тэматычных аспектаў твора; 3) чытач можа заняць пэўную пазіцыю ў дачыненні да тэксту: ён можа адхіліць як алегарычныя, так і паэтычныя варыянты інтэрпрэтацыі тэксту”[2] [1, с. 470].

Дастаткова паказальныя прыклады гэтых тэарэтычных высноў назіраем у п’есе С. Кавалёва “Драўляны Рыцар” (1987), якая па сваёй сутнасці ўяўляе сабой інтэртэкст. Аўтар спалучае некалькі культурных дыскурсаў у адным творы. Так, знешне сюжэт нагадвае традыцыйную чарадзейную казку з выкраданнем Яе (Дзяўчынкі), што спалучаецца з традыцыямі сярэднявечнага рыцарскага рамана. Тут Драўляны Рыцар павінен здзейсніць свой асобы шлях (так званы “квэст”) не столькі прасторавы, колькі душэўны шлях пазнання, праверку на сумленнасць.

Адначасова ў канву твора ўключаюцца міфы пра фей, міфалагічныя істоты Зморы, Скныра, Здані. Цмока, Дамавічка.

Часава-прасторавыя адносіны ўскладнены. З аднаго боку дзеянне адбываецца ў рэальным свеце, у “старым драўляным доме на ўскрайку лесу” [2, с. 110], дзе “недарэчны замок на дзвярах вартуе цішу, пустэчу і змрок” [2, с. 110], дзе “некалі жылі людзі, гарэў агонь у печы, спяваліся песні” [2, с. 110]. З другога – казачны свет, Каралеўства Сноў, дзе ёсць месца фантастычным персанажам і незвычайным учынкам. Такім чынам ствараецца асобы каларыт блізкасці дзеяння твора да рэальнасці рэцыпіента, што дае магчымасць, напрыклад, падлетку ўключыцца ў прапанаваную гульню.

Час, які і ў большасці твораў фэнтэзі, “падобны на час міфалагічны, што развіваецца цыклічна – як і сам свет, які паслядоўна праходзіць этапы гарманічнага і хаатычнага існавання, што перацякаюць адзін у другі, утвараючы мадэль паўтаральнага быцця” [4, сл. 1161]. Пры гэты адбываецца ідэалізацыя мінулага і своеасаблівая дэманізацыя будучага, якое з’яўляецца недастаткова пэўным.

Вобразная сістэма ўяўляе сабой палярны свет.

Полюс святла – гэта маленькі Драўляны Рыцар, які здольны на вялікі ўчынак. Ён падобны на герояў фальклорных чарадзейных казак, якія

[2] Тут і далей пераклад з рускай мовы наш. – В.К.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выконваюць сакральны рытуал ініцыяцыі, і адначасова гэты персанаж уяўляецца шукальнікам унутранай гармоніі, таму ад самага пачатку з'яўляецца адзінокім. Драўляны Рыцар блізкі да рамантычных герояў, якім уласціва трагічнае падваенне ўнутранага свету, ён дзейнічае ў адпаведнасці з ідэальнымі рыцарскімі законамі ахвярнасці, чым здзіўляе ўсіх: "Змора. Дурань, жыццё можна абмяняць толькі на жыццё. А які вар'ят аддасць добраахвотна сваё жыццё дзеля жыцця іншага? Вяртайся дадому і забудзься на сваіх сяброў" [2, с. 140].

Драўляны Рыцар не можа здрадзіць сваім ідэалам і тады, калі даведваецца, што ён будзе нікому не патрэбны праз пяць гадоў, і тады, калі будзе ведаць, што загіне.

Адзначым, што ў гісторыі рыцар ніколі не быў цалкам вольным чалавекам, бо заўсёды служыў свайму сеньёру. Драўляны Рыцар таксама служыць Хлопчыку і Дзяўчынцы і збіраецца ў будучым служыць іх дзецям. Пры гэтым, ён не пазбаўлены здаровага авантурызму і гатовы прыйсці на дапамогу тым, каму зараз горш, хто просіць дапамогі.

Важнай праблемай твора з'яўляецца праблема выбару, што дазваляе сцвярджаць пра экзістэнцыйны ўплыў. Чалавек здольны спасцігнуць экзістэнцыю (фактычна сваё існаванне) толькі ў памежных сітуацыях (пакуты, барацьба, смерць). Спасцігаючы сябе як экзістэнцыю, чалавек набывае не толькі свабоду, якая ёсць выбар самога сябе, сваёй існасці, але і пачуццё ўласнай адказнасці за тое, што адбываецца ў свеце. Драўляны Рыцар з'яўляецца адначасова ідэальным і вельмі блізкім да рэальнасці, што робіць яго дастаткова прыцягальным для рэцыпіента.

Полюс цемры – Змора і Скныр, якім не падабаецца дабро. Яны значна большыя па памерах за Драўляна Рыцара (выкарыстоўваюць чарадзейны пярсцёнак, каб выклікаць "вялізны, велічынёю з чалавека, бот"), часта смяюцца з маленькіх. У рэцэпцыйным успрыняцці яны ўяўляюць сабой вялікую небяспеку, бо валодаюць чарадзейнымі пярсцёнкамі, не спыняюцца ні перад чым, каб захапіць скарбы з залатога сну.

У п'есе рэзкае размежаванне "добры" – "злосны", "свой" – "чужы" набывае асобы характар. Даволі падрабязна перад рэцыпіентам разгортваецца задума Скныра і Зморы, якія вызначаюцца хітрасцю і розумам, але розум іх скіраваны на здзяйсненне зла. Праз гэта Скныр лічыць, што ён непераможны. Як ужо адзначалася вышэй, Скныр і Змора не могуць зразумець ахвярнасць Драўлянага Рыцара, што стварае сітуацыю непаразумення, блізкую па сутнасці да абсурднай.

Разам з тым, у творы яўна заўважаецца іранічнае стаўленне да эгаізму Скныра праз пастаяннае паўтарэнне падобных фраз:

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

“Змора. Які ты ў мяне ўсёмагутны, Скнырчык!

Скныр. **Я яшчэ ўсёмагутнейшы**! (выдзелена намі – В.К.)” [2, с. 135].

У фінале, калі гэтыя два пазнаюць пачуццё любові, то “**Я”** мяняецца на “**Ты**”:

“Змора. Скнырчык, ты самы прыгожы і мілы на свеце!

Скныр. **Ты яшчэ прыгажэйшая і мілейшая, Зморачка**! (выдзелена намі – *В.К.*)” [2, с. 141].

Адсюль вынікае, што галоўная задача станоўчага героя – не перамагчы адмоўных праз іх фізічнае знішчэнне, а дапамагчы ім пераканацца ў ілжывасці ідэалаў, якім яны служаць.

Спецыфічнай асаблівасцю фэнтэзійных твораў з’яўляецца наяўнасць прамежкавых герояў, якія могуць быць бліжэйшымі да полюсу святла ці полюсу цемры.

Такія героі часцей бываюць пасіўнымі назіральнікамі або марыянеткамі ў межах ідэй дабра ці зла.

Так, сама Фея Сноў пры тым, што ёй забаронена рабіць злыя ўчынкі праз чараўніцтва Скныра ператварае Хлопчыка і Дамавічка ў кветкі.

Хлопчык жа і Дамавічок, а таксама Дзяўчынка – таксама прамежкавыя героі, бо часцяком становяцца ахвярамі ўласных заганаў (ляноты, няўважлівасці да сябе і іншых). Дастаткова паказальнай з’яўляецца адна з фінальных сцэн, дзе толькі пасля нагадвання Феі дзеці і Дамавічок успомнілі пра Драўлянага Рыцара, які знік у чацвёртым “кашмарным” сне, каб выратаваць усіх.

Цікавасць выклікаюць і вобразы Кветкі-Сну, Караля-Баязліўца, Жаўнера, Здані і Цмока. Усе яны ў большай або меншай ступені падвяргаюцца маніпуляванню з боку Скныра і Зморы або Драўлянага Рыцара. Розніца толькі ў тым, ці можа той або іншы герой усвядоміць сваю памылку і стаць на шлях выпраўлення.

У дадзеным выпадку прамежкавыя героі з’яўляюцца своеасаблівым папярэджаннем, якім нельга быць, але якім можна стаць, калі развучышся бачыць боль іншага, калі будзеш бачыць толькі ўласныя праблемы.

Такім чынам, прапанаваная для пазакласнага чытання па Беларускай літаратуры ў восьмым класе п’еса С. Кавалёва “Драўляны рыцар” з’яўляецца цікавым узорам літаратуры фэнтэзі. Яна дае вучням узор “сумленнай літаратуры”, якой бракуе ў сучасным літаратурным працэсе. Разам з тым, адпавядае запатрабаванням падлеткаў як чытачоў, фарміруе ў іх добры літаратурны густ, вучыць адчуваць прыгожае, сапраўднае ад штучнага. Таксама дае магчымасць развіваць чытацкія здольнасці, падштурхоўвае да

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пазнання новага і можа служыць узорам для цікавых літаратуразнаўчых назіранняў.

Літаратура

1. Западное литературоведение XX века : энциклопедия ; под ред. Е.А. Цургановой. – М. : Intrada, 2004. – 560 с.

2. Кавалёў, С. Драўляны  Рыцар // Кавалёў, С. Шлях да Батлеему : п’есы-казкі / С. Кавалёў. – Мінск : Маст. літ. – С. 109-143.

3. Ковтун, Е.Н. Поэтика необычайного : Художественные миры фантастики, волшебной сказки, утопии, притчи и мифа (на материале европейской литературы первой половины XX века) / Е.Н. Ковтун. – М. : Изд-во МГУ, 1999. – 308 с.

4. Литературная энциклопедия терминов и понятий ; под ред. А.Н. Николюкина. – М : НПК “Интелвак”, 2003. – 1600 стб.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ